СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

## Ў ВНУ БЕЛАРУСКАЙ ССР НА 1991 ГОД

1. У вышэйшыя навучальныя ўстановы БССР прымаюцца грамадзяне СССР і іншаземныя грамадзяне, пражываючыя ў СССР, якія маюць сярэднюю адукацыю. На навучанне без адрыву ад вытворчасці прымаюцца, як правіла, асобы, пражываючыя ў БССР.

2. Усе паступаючыя карыстаюцца роўнымі правамі незалежна ад паходжання, полу, мовы, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання і адносін да рэлігіі, узросту і характару заняткаў.

3. Паступленне і залічэнне асоб на педагагічныя спецыяльнасці ў 1991 годзе рэгулюецца Міністэрствам народнай адукацыі БССР.

4. Да заявы аб прыёме ў вышэйшыя навучальныя ўстановы паступаючыя прыкладаюць дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, 6 фотакартак памерам 3×4 см, медыцынскую даведку*, а на навучанне без адрыву ад вытворчасці — і выпіску з працоўнай кніжкі, прад'яўляюць пашпарт.

5. На дзённую форму навучання заявы прымаюцца з 25 чэрвеня па 15 ліпеня, экзамены праводзяцца з 16 ліпеня. Залічэнне праводзіцца да 5 жніўня. На спецыяльнасці мастацтва, а таксама на навучанне без адрыву ад вытворчасці прыём праводзіцца ў тэрміны, вызначаемыя ВНУ і ўзгодненыя з органамі кіравання вышэйшымі навучальнымі ўстановамі па падпарадкаванню.

6. ВНУ можа ўстанавіць 3—5 уступных экзаменаў, адзін з якіх — па беларускай мове і літаратуры. Прыёмным камісіям ВНУ прадастаўляецца права аднесці частку экзаменаў да профільных (конкурсных) праводзімых, як правіла, у пісьмовай форме, а таксама ўстанаўліваць пры неабходнасці двухбальную ацэнку астатніх экзаменаў: па сістэме «залік», «незалік». Пералік уступных экзаменаў па спецыяльнасці аб'яўляецца ВНУ за тры месяцы да пачатку іх правядзення.

7. Уступныя экзамены (акрамя экзаменаў па спецыяльнасці ў ВНУ мастацтва і фізічнага выхавання) праводзяцца па праграмах, адпавядаючых навучальным праграмам сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

8. Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца.

9. Апеляцыі па пытанню змянення экзаменацыйнай адзнакі павінны падавацца паступаючым у дзень правядзення вуснага экзамену або ў дзень абвяшчэння адзнакі па пісьмоваму экзамену. Парадак падачы заяў і разгляд апеляцый устанаўлівае рэктар, аб чым да пачатку экзаменаў павінна быць даведзена да ведама паступаючых.

10. Залічэнне ў ВНУ праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных паступаючымі на ўступных профільных экзаменах, пры атрыманні станоўчых адзнак пры здачы астатніх (няпрофільных) экзаменаў.

Парадак залічэння выпускнікоў падрыхтоўчых аддзяленняў, асоб, якія набралі аднолькавую колькасць балаў, а таксама асоб, паступаючых на навучанне без адрыву ад вытворчасці, устанаўліваецца прыёмнай камісіяй ВНУ.

Без уступных экзаменаў залічваюцца ў ВНУ пераможцы** Міжнародных, Усесаюзных, а таксама Рэспубліканскіх (БССР) алімпіяд выпускнікоў агульнаадукацыйных школ і ПТВ, праведзеных Мінадукацыяй БССР у 1990-91 гадах.

Узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, закончыўшыя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы або прафесійна-тэхнічныя вучылішчы на базе няпоўнай сярэдняй школы з дыпломам з адзнакай здаюць адзін экзамен, устаноўлены прыёмнай камісіяй. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» — здаюць астатнія экзамены. Прыёмная камісія мае права распаўсюдзіць на гэту катэгорыю асоб агульныя Правілы прыёму, або прыняць рашэнне аб іх залічэнні без уступных экзаменаў. Асобы, якія закончылі з дыпломам з адзнакай прафесійна - тэхнічныя вучылішчы на базе сярэдняй адукацыі, здаюць адзін экзамен пры паступленні на спецыяльнасці, адпавядаючыя атрыманым прафесіям. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» — здаюць астатнія экзамены.

Пераможцы** (I, II, III месцы) абласных і Мінскага гарадскога тураў (БССР) алімпіяд вучняў (1990 і 1991 гадоў), праводзімых органамі кіравання Мінадукацыі БССР альбо алімпіяд, праводзімых ВНУ, па рашэнню прыёмнай камісіі могуць быць вызвалены ад уступнага экзамену па адпаведнай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі «пяць».

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас, якія карыстаюцца ўстаноўленымі ўрадам ільготамі; дзеці — круглыя сіраты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў: інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыцынска-працоўных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі.

У асобных выпадках Міністэрствам народнай адукацыі БССР ВНУ можа быць дадзена магчымасць залічэння паступаючых на I курс без правядзення ўступных экзаменаў.

11. На навучанне без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы, якія працуюць па профілю выбранай спецыяльнасці, на аснове дагавораў паміж ВНУ і зацікаўленымі прадпрыемствамі і арганізацыямі.

Наяўнасць дагавораў не патрэбна пры прыёме педагагічных і культурна-асветніцкіх работнікаў, інвалідаў I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыцынска-працоўных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі, а таксама асоб, якія па незалежных ад іх прычынах не могуць працаваць па атрыманай раней прафесіі.

12. Заключэнне дагавораў паміж ВНУ і прыватнымі асобамі дапушчальна толькі ў выпадках паступлення гэтых асоб для атрымання другой адукацыі.

13. Асобы, пастаянна пражываючыя ў зоне строгага санітарнага кантролю, паспяхова здаўшы ўступныя экзамены, але не прайшоўшыя па конкурсу на дзённае навучанне ў ВНУ, па іх жаданні залічваюцца ў першачарговым парадку на падрыхтоўчыя аддзяленні пры данай ВНУ.

14. Усе пытанні, звязаныя з прыёмам у ВНУ, вырашаюцца прыёмнымі камісіямі. Інфармацыя аб умовах прыёму, а таксама па ўсіх рашэннях прыёмнай камісіі павінна своечасова даводзіцца да ведама паступаючых.

* Канкрэтныя спецыяльнасці, навучанне на якіх прадугледжвае абавязковасць падачы медыцынскай даведкі, вызначаюцца ВНУ.

** Гэтыя палажэнні не распаўсюджваюцца на ВНУ творчыя, культуры, медыцынскія, інстытут фізічнай культуры, а таксама на спецыяльнасці правазнаўства, журналістыка, сацыялогія, міжнародныя эканамічныя адносіны.

# КАМЕНТАРЫЙ

## начальніка Галоўнага ўпраўлення вышэйшай школы Міністэрства народнай адукацыі БССР В. І. СТРАЖАВА

У 1990 годзе скончыўся тэрмін дзеяння Правілаў прыёму ў ВНУ СССР, устаноўленых у 1988 годзе. Час паказаў, што, у асноўным, гэтыя правілы адпавядаюць рэаліям дня, таксама як і пацвердзіў неабходнасць прадастаўлення большай свабоды дзеяння непасрэдна навучальным установам. Дзяржкамітэт па адукацыі СССР зацвердзіў новыя Тыпавыя правілы прыёму, зрабіўшы заўвагу, што рэспубліканскія органы кіравання маюць права ўносіць у іх змяненні, якія ўлічваюць канкрэтныя мясцовыя ўмовы. Калі параўнаць гэтыя Тыпавыя правілы з рэспубліканскімі, то ўважлівы чытач і сам, безумоўна, можа вызначыць адрозненне паміж імі. Але важны, відаць, не столькі гэты факт, колькі яго прычына, растлумачэнню якіх і прысвечаны гэты каментарый.

Перш-наперш неабходна спыніцца на тым, што адрознівае Правілы прыёму ў ВНУ СССР ад тых, што дзейнічалі раней і што новае прысутнічае ў рэспубліканскіх.

Новыя правілы акрэсліваюць толькі агульныя палажэнні і патрабаванні, якія павінны забяспечыць усім грамадзянам роўныя правы на атрыманне вышэйшай адукацыі. Першыя два пункты прыводзяць правілы прыёму ў адпаведнасць з Міжнароднай дэкларацыяй правоў чалавека і з Канстытуцыяй СССР.

У рэспубліканскіх правілах, аднак, пры паступленні на безадрыўныя формы навучання перавага аддаецца жыхарам рэспублікі. Раней існавалі абмежаванні па прыёму на завочныя аддзяленні ў залежнасці ад месца пражывання. «Як правіла» ўведзена, каб абараніць інтарэсы нашых суайчыннікаў, якія жывуць за межамі Беларусі — Калінінградскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і іншых абласцях, Літве, Казахстане.

Знята абмежаванне па ўзросту (раней на дзённую форму навучання прымаліся асобы ва ўзросце да 35 гадоў). Пры паступленні ў медыцынскія ВНУ адменена патрабаванне аб неабходнасці абітурыенту мець двухгадовы медыцынскі стаж работы. Паступаючаму няма неабходнасці ў прадстаўленні ўсялякіх характарыстык і рэкамендацый, дакумента аб адносінах да вайсковага абавязку. Да таго ж у рэспубліканскіх правілах устаноўлена, што неабходнасць прадстаўлення медыцынскай даведкі вызначаецца самой ВНУ.

Міністэрства, уводзячы ў якасці абавязковага экзамен па беларускай мове і літаратуры, палічыла неабходным, каб у гэтым выпадку мінімальная колькасць экзаменаў была роўнай тром, а не двум. Для садзейнічання будучым абітурыентам у лепшай падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў ВНУ павінны не менш чым за тры месяцы да ўступных экзаменаў вызначыць іх пералік.

ВНУ прадастаўлена права самім вызначаць парадак залічэння асоб, якія набралі аднолькавую колькасць балаў, выпускнікоў падрыхтоўчых аддзяленняў, а таксама асоб, якія паступаюць на безадрыўныя формы навучання.

Значныя змяненні ўнесены ў парадак паступлення ў ВНУ «медалістаў» школ і прыроўненых да іх выпускнікоў іншых навучальных устаноў. Вядома, што ў розныя часы дзейнічалі розныя ўмовы прыёму гэтай катэгорыі абітурыентаў: медаль прадастаўляла права на залічэнне без экзаменаў. Быў перыяд, калі яе наяўнасць увогуле не прымалася да ўвагі. У апошнія некалькі гадоў усталявалася практыка здачы аднаго экзамену. Але ж відавочна недарэчнасць уніфікацыі ў вырашэнні гэтай праблемы, бо, па-першае, конкурсы для паступаючых не аднолькавыя не толькі ў розных навучальных установах, але і для розных спецыяльнасцей у адной і той жа ВНУ, па-другое, «вага» медаля, на жаль, далёка не адна і тая ж для розных школ. Менавіта гэтыя абставіны і прывялі да рашэння прадаставіць права вызначэння формы прыёму «медалістаў» непасрэдна ВНУ.

Новыя правілы прыёму прадастаўляюць у яўным выглядзе квоты пераможцам алімпіяд. Назапашаны за апошнія два гады вопыт сведчыць, што, як правіла, усе яны маюць высокі ўзровень падрыхтоўкі, які дае магчымасць паспяхова навучацца ў вышэйшай навучальнай установе.

Правілы прыёму прадугледжваюць залічэнне паступаючых на першы курс без экзаменаў. Сёння магчыма было б пералічыць чакаемыя сітуацыі, у якіх ажыццяўлялася б такая магчымасць, але мэтазгодна ўсё-такі праверыць на практыцы рэалізацыю гэтага палажэння.

Пры прыёме на безадрыўныя формы навучання аддаецца перавага асобам, якіх накіроўваюць на навучанне ў адпаведнасці з дагаворамі паміж зацікаўленымі прадпрыемствамі, установамі і ВНУ, але гэта палажэнне распаўсюджваецца, па сутнасці, толькі на інжынерныя спецыяльнасці.

На працягу апошніх гадоў пры прыёме ў ВНУ абітурыенты з зоны строгага санітарнага кантролю карысталіся правам на пазаконкурсны прыём. Аднак многія з іх мелі ў далейшым вялікія цяжкасці ў навучанні з-за недастатковай школьнай падрыхтоўкі. Таму было б мэтазгодна даць тым, хто мае здольнасці і жаданне вучыцца ў ВНУ, але з-за незалежачых ад іх абставін не атрымаў неабходнай падрыхтоўкі, магчымасць ліквідаваць прабелы ў ведах праз падрыхтоўчыя аддзяленні. Менавіта ў гэтым і заключана сутнасць пункта 13 Правілаў прыёму ў ВНУ рэспублікі.

*Там, дзе мы будзем адпачываць*

# ПРАСТОРЫ КАРЭЛІІ

Карэлія валодае таямнічай сілай прыцягваць, заварожваць чалавека, калі ён хоць адзін раз пабываў у ёй. Тут — незлічоныя азёры, камяністыя і скалістыя ўзгоркі, лясныя масівы. Жамчужыны Карэліі: возера Валаам, Ладажскае і Анежскае азёры, Марцыяльныя воды, Кіжы, вадаспадКівач.

Воды Карэліі чыстыя, паветра празрыстае. У вадаёмах водзяцца ласосевыя і фарэль, у лясах — алені, лосі, мядзведзі, дзікі, іншая дробная жыўнасць.

Клімат Карэліі суровы: з працяглай зімой і ласкавым летам. Кароткае лета буяе зелянінай змешаных лясоў. У пачатку мая растае апошні снег, вясна непрацяглая, дружная. У Карэліі самыя кароткія ночы летам, усяго 3 гадзіны 45 мінут, і называюцца яны белымі. Ноччу так светла, што можна нават чытаць кнігу. Сярэдняя тэмпература ліпеня +17°С, але бывае і да +30°С.

У пачатку ліпеня паспявае земляніка, потым суніца, маліна, а ў жніўні — марошка, брусніцы, журавіны. Лясы багатыя на грыбы, лекавыя травы.

Зіма ў Карэліі мяккая і шматснежная.

Сталіца Карэліі — Петразаводск. Горад размешчаны на беразе Анежскага возера. Будучы Петразаводск пачынаўся з будаўніцтва жалезаробчага і гарматнага заводаў па ўказу Пятра I у 1703 годзе. Праз 70 год Петразаводск стаў цэнтрам Аланецкай губерні, дзе жыў Г. Р. Дзяржавін — выдатны рускі паэт, які быў у той час губернатарам Аланецкага намесніцтва.

А яшчэ праз 100 гадоў Петразаводск стаў горадам навукі, горадам студэнтаў. Тут размешчаны філіял Акадэміі навук, тры вышэйшыя навучальныя ўстановы. Петразаводск— культурны цэнтр, які мае чатыры тэатры: рускі і фінскі драматычныя, музычны і лялечны. У горадзе ёсць краязнаўчы музей. Цікавасць уяўляе і музей выяўленчых мастацтваў, у якім ёсць унікальныя арыгіналы карцін рускіх мастакоў І. Рэпіна, А. Куінджы.

У 54-х км ад Петразаводска размешчаны санаторый «Марцыяльныя Воды». Тут, у даліне руданоснага балота, б'юць жалезістыя мінеральныя крыніцы і залягаюць лячэбныя габазерскія гразі. Больш 250 гадоў назад на гэтых крыніцах узнік першы ў Расіі курорт. Сюды не аднойчы прыязджаў лячыцца Петр I са сваёй сям'ёй і прыдворнай знаццю. Пасля смерці Пятра I курорт перастаў існаваць.

Ў 1948 г. на аснове захаваўшыхся помнікаў — царквы Пятроўскага часу, павільёнаў, тут быў адкрыты музей, які пазней назвалі музеем-запаведнікам «Марцыяльныя Воды». Непадалёку ад яго, усяго ў 1,5 км, размешчаны Утукскі заказнік славутай карэльскай бярозы. А вядомы вадаспадКівач знаходзіцца на рацэ Суне. Г. Р. Дзяржавін у адным са сваіх вершаў уславіў гэты вадаспад. Трэба сказаць, што сёння ён не такі ўжо і грандыёзны, таму што частка вады адКівача адведзена на ГЭС і на збудаваны 200-мятровы спуск для пропуску сплаўленага лесу. Але ўсё ж вадаспадКівач становіцца грандыёзным пры вялікай вадзе. 10 тыс. га лесу каляКівача аб'яўлены запаведнікам, і прагулка па гэтаму музею прыроды прыносіць вялікае задавальненне і пакідае незабыўныя ўражанні.

Кіжы — яшчэ адзін музей-запаведнік народнай драўлянай архітэктуры і этнаграфіі Карэліі, Анежскага возера. Сюды перавезены драўляныя помнікі, створаныя рукамі чалавека, з многіх вёсак: васьмікрылы млын, курная хата з цудоўнай разьбой і г. д. Але асноўную каштоўнасць уяўляе 22-галовая Праабражэнская царква (1714 г.), 9-галовая Пакроўская царква (1764 г.) і шатровая званіца (1874 г., будаўнік Пятрухін). Узведзены без адзінага цвіка, гэты комплекс драўляных збудаванняў надзвычай уражвае.

Яшчэ адно вельмі цікавае месца ў Карэліі — востраў Валаам, які знаходзіцца ў Ладажскім возеры. Гісторыя Валаама пачынаецца яшчэ з XIV стагоддзя, калі тут існаваў Валаамскі манастыр. Па ўказу Пятра I апошні быў адноўлены (а ён разбураўся ў XVI—XVII ст. ст.) у 1715 годзе. Усе збудаванні на Валааме ўдала ўпісаны ў акаляючую іх маляўнічую прыроду. На востраве незвычайны для паўночных шырот раслінны свет. Граніца натуральнага распаўсюджання дуба, напрыклад, праходзіць паўднёвей, а на Валааме моцныя дубы ўтвараюць маляўнічыя гаі, алеі. Растуць піхта бальзамічная і кедр сібірскі, ёлка серабрыстая і лістоўніца еўрапейская. Валаамскі манастыр быў адначасова палітычным і эканамічным цэнтрам. Ён славіўся сваімі багаццямі, добра адладжанымі рамёствамі і сельскай гаспадаркай, створанай на суровых скалістых астравах. На голыя скалы вострава манахі наносілі дробныя камені, прыкрывалі іх пластом прагніўшага ляснога галля і затым насыпалі слой зямлі вышынёй у паўтара метра. На гэтай глебе вырошчваліся славутыя манастырскія сады, агароды і кветнікі з дынямі, агуркамі, яблыкамі розных гатункаў. З 1980 г. Валаам — музей-запаведнік. І асабліва ён нам дарагі, калі ўлічыць, што яго прыгажосць услаўлялі ў сваіх творах мастакі І. І. Шышкін, А. І. Куінджы, Ф. А. Васільеў, М. І. Рэрых.

Калісьці сюды імкнуліся паломнікі — пакланіцца валаамскім святыням. Пазней прыцягваў ён і савецкіх людзей — мастакоў, пісьменнікаў і кампазітараў.

З нядаўняга часу Карэлія прыцягнула ўвагу і нашага універсітэта. У паўночнай частцы Ладагі, на яе беразе ў пасёлку Імпілахці універсітэтам рэканструіруецца будынак былой школы пад базу адпачынку. Геалагічны ж факультэт звярнуў увагу на Карэлію як на базу практык. Пасёлак Піткяранта з'яўляецца ўнікальным месцам, дзе можна знайсці і пазнаёміцца з вялікай колькасцю мінералаў, якія сустракаюцца ў аголеных пародах і адвалах шахт.

У Карэліі жывуць ветлівыя людзі. Большасць насельніцтва — рускія. Беларусы складаюць прыкладна трэцюю частку, там можна сустрэць і нашых землякоў з Гомеля.

Цэлюлозны завод п. Піткяранты прапануе універсітэту дапамогу ў прадастаўленні месц у піянерскім лагеры. Там могуць прыняць па 15 дзяцей на I і II змены. Перыяды адпачынку: I змена — 18.06 — 11.07; II змена — 16.07—8.08. Піянерскі лагер знаходзіцца на беразе Ладажскага возера, у 18 км ад Піткяранты. З нашымі дзецьмі павінны выехаць два выхавацелі. Кошт пуцёўкі ў межах 100 руб.

**А. ПІНЧУК,**
**дэкан геалагічнага факультэта.**
**В. РАМАНАВА.**



**НА ЗДЫМКУ: дэкан геафака А. П. Пінчук у цудоўным куточку на Валааме.**

## ДНІ ГІСТФАКА

У зусім яшчэ кароткай біяграфіі гістарычнага факультэта яны праводзіліся з 11 па 17 сакавіка. Будучыя гісторыкі і іх выкладчыкі пастараліся зрабіць сваё свята змястоўным і запамінальным. У праграму ўваходзілі канцэрт мастацкай самадзейнасці, пасяджэнне КВЗ, дыскатэка, іншыя мерапрыемствы.

## СВЯТА ФІЗІКАЎ І МАТЭМАТЫКАЎ

Эй! Дети Скорины...

Грядет Великий праздник! Праздник радости единения! Разлученные злым роком, разделенные улицей Песина, физики и математики протягивают друг другу руки!

Всех, кому небезразлична идея Общей Судьбы, мы приглашаем на Дни ФИЗМАТа, которые будут проходить с 28 по 31 марта 1991 г.

Следите за рекламой!

**ОРГКОМИТЕТ «ДФМ—91».**

# ВАМ, КНІГАЛЮБЫ

### ПАВАЖАНЫ СЯБАР!

На працягу трох гадоў аддзел сацыялагічных даследаванняў Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР праводзіць масавае апытанне чытачоў з мэтай вывучэння папулярнасці беларускай мастацкай кнігі, выдадзенай у рэспубліцы.

Запрашаем вас пазнаёміцца са спісам кніг, якія выйшлі з друку ў 1990 годзе, і адзначыць тыя з іх, якія вы прачыталі. Насупраць назваў твораў абвядзіце кружочкам лічбу, адпаведную вашаму меркаванню: 1 — прачытаў з вялікай цікавасцю; 2 — спадабалася; 3 — не ўразіла.

**Просім вас прыняць удзел у анкетаванні.**

| № п/п | Аўтар, назва | Адзнака твора | | |
|---|---|---|---|---|
| | **Паэзія** | | | |
| 1. | **Адамовіч С.** Кальварыйскія клёны. Б-ка «Маладосць» | 1 | 2 | 3 |
| 2. | **Айзенштадт В.** Слух сердца | 1 | 2 | 3 |
| 3. | **Аксёнцев Ф.** После всего | 1 | 2 | 3 |
| 4. | **Аколава В.** Вяртанне ў заўтра | 1 | 2 | 3 |
| 5. | **Акулін Э.** Пяшчота ліўня. Б-ка «Маладосць» | 1 | 2 | 3 |
| 6. | **Аўрамчык М.** Анкета | 1 | 2 | 3 |
| 7. | **Баравікова Р.** Пад небам першага спаткання | 1 | 2 | 3 |
| 8. | **Барадулін Р.** Самота паломніцтва | 1 | 2 | 3 |
| 9. | **Бітэль П.** Дзве вайны | 1 | 2 | 3 |
| 10. | **Бічэль-Загнетава Д.** На Палессі | 1 | 2 | 3 |
| 11. | **Бурачок М.** (Францішак Багушэвіч). Дудка беларуская | 1 | 2 | 3 |
| 12. | **Вераб'ёў П.** Крытычная маса | 1 | 2 | 3 |
| 13. | **Вольскі А.** Наваселле дрэў | 1 | 2 | 3 |
| 14. | Вяселле. Мелодыі. **Серыя «Беларуская народная творчасць»** | 1 | 2 | 3 |
| 15. | **Гальняровіч Н.** Брама | 1 | 2 | 3 |
| 16. | **Гаўрук Ю.** Узвіхраны ветразь | 1 | 2 | 3 |
| 17. | **Геніюш Л.** Белы сон | 1 | 2 | 3 |
| 18. | **Гілевіч Н.** Дыялог на бягу. Б-ка «Вожык» | 1 | 2 | 3 |
| 19. | **Гудкова М.** Віра | 1 | 2 | 3 |
| 20. | Дзень паэзіі — 89. Літ. зборнік | 1 | 2 | 3 |
| 21. | **Дзеружынскі А.** Бярозавы вецер | 1 | 2 | 3 |
| 22. | **Дракохруст А.** Исповедь | 1 | 2 | 3 |
| 23. | **Дранько-Майсюк Л.** Тут | 1 | 2 | 3 |
| 24. | **Жуковіч В.** Разняволенне | 1 | 2 | 3 |
| 25. | **Зуёнак В.** Лета трывожных дажджоў | 1 | 2 | 3 |
| 26. | **Каробкіна С.** Арабескі восені зялёнай | 1 | 2 | 3 |
| 27. | Квадра: Вершы літаб'яднання «Узлёт» | 1 | 2 | 3 |
| 29. | **Куртаніч В.** Птушыным шляхам | 1 | 2 | 3 |
| 28. | **Корбан У.** Не на сваім месцы | 1 | 2 | 3 |
| 30. | **Кусянкоў М.** Дуброва | 1 | 2 | 3 |
| 31. | **Лапушин Р.** Три взгляда | 1 | 2 | 3 |
| 32. | **Лісіцын У.** Беларусь — мая калыска | 1 | 2 | 3 |
| 33. | **Лойка А.** Талая вясна | 1 | 2 | 3 |
| 34. | Маладым паходам. Зборнік паэзіі | 1 | 2 | 3 |
| 35. | **Мацяш Н.** Шчаслівай долю назаві... | 1 | 2 | 3 |
| 36. | Народу свайму ўслугуючы... Творы бел. аўтараў, прысвечаныя Францыску Скарыне | 1 | 2 | 3 |
| 37. | **Наўроцкі А.** Пакаленні і папялішчы | 1 | 2 | 3 |
| 38. | **Пашкоў Г.** Люблю, спадзяюся, жыву... | 1 | 2 | 3 |
| 39. | Постижение. Книга поэзии | 1 | 2 | 3 |
| 40. | **Пісарык А.** Дажджы яравыя | 1 | 2 | 3 |
| 41. | **Полоцкий С.** Вирши | 1 | 2 | 3 |
| 42. | **Пранузa П.** Рукі салдата | 1 | 2 | 3 |
| 43. | **Прудніқаў П.** Позняя ягады | 1 | 2 | 3 |
| 44. | **Прыходзька П.** Споведь любові | 1 | 2 | 3 |
| 45. | Ростані волі: **З заходне-беларускай паэзіі** | 1 | 2 | 3 |
| 46. | **Рубін І.** Вянок надзеі. Б-ка «Маладосць» | 1 | 2 | 3 |
| 47. | **Рублеўская Л.** Крокі па старых лесвіцах. Б-ка «Маладосць» | 1 | 2 | 3 |
| 48. | Свет милосердия. Книга поэзии | 1 | 2 | 3 |
| 49. | **Свірка Ю.** Кружка з пяшчаным дном | 1 | 2 | 3 |
| 50. | **Симанович Д.** Сентябри | 1 | 2 | 3 |
| 51. | **Скобла М.** Вечны Зніч. Б-ка «Маладосць» | 1 | 2 | 3 |
| 52. | **Скурко І.** Весніцы | 1 | 2 | 3 |
| 53. | **Спринчан Б.** Жизни вечные круги | 1 | 2 | 3 |
| 54. | Стары Улас. Год беларуса | 1 | 2 | 3 |
| 55. | **Строцев Д.** Тридцать восемь | 1 | 2 | 3 |
| 56. | **Стрыгалёў М.** Дзевяты кардон | 1 | 2 | 3 |
| 57. | **Танк М.** Паслухайце, вясна ідзе | 1 | 2 | 3 |
| 58. | **Трафімчук М.** Трыванне | 1 | 2 | 3 |
| 59. | **Хаўратовіч В.** Зямныя колеры і гукі | 1 | 2 | 3 |
| 60. | **Шаховіч М.** Бераг дабрыні | 1 | 2 | 3 |
| 61. | **Швед В.** Мая зялёная Зубровія | 1 | 2 | 3 |
| 62. | **Шэлехаў М.** Сын яблыні | 1 | 2 | 3 |
| 63. | **Шніп В.** Шляхам ветру | 1 | 2 | 3 |
| 64. | **Шутенко Г.** Горит костер воспоминаний | 1 | 2 | 3 |
| 65. | **Шымук В.** Спелы жнівень | 1 | 2 | 3 |
| 66. | **Янчанка М.** Жыцейка — жыта | 1 | 2 | 3 |

**(Заканчэнне на 4-й стар.).**

